***Я. С. Ермакоў***
*Навук. кір.* ***С. А. Чаропка,***
*канд. гіст. навук, дацэнт*

## СПРОБЫ МІРНАГА ВЫРАШЭННЯ СЭЦЭСІЙНАГА КРЫЗІСУ Ў ЗЛУЧАНЫХ ШТАТАХ АМЕРЫКІ

Сэцэсійны крызіс ў ЗША з'яўляецца адной з ключавых праблем у гісторыі гэтай краіны. Цікавым яго аспектам з'яўляюцца спробы мірнага вырашэння гэтага крызісу, якія будуць разгледжаны намі ніжэй.

Яшчэ да пачатку эскалацыі канфлікту, а менавіта 8 снежня 1860 г., Дж. Крытэндэнам, сенатарам з Кентукі, быў прапанаваны план мірнага выхаду з крызісу. Паводле плану лінія Місурыйскага кампрамісу 1820 г. падаўжалася да Ціхага акіяна, рабства забаранялася да поўначы ад гэтай лініі, але дазвалялася да поўдня ад яе.

Прапановы Крытэндэна былі перададзены ў адмысловыя камітэты абедзвюх палат Кангрэса, аднак ён не атрымаў там падтрымкі. Паводле меркавання амерыканскага гісторыка Дж. Родса, калі б прапановы кампрамісу Крытэндэна былі вынесены на агульнанацыянальны рэферэндум, то, магчыма бы кампраміс атрымаў згоду грамадства.

Другой спробай мірна вырашыць канфлікт стала мірная канферэнцыя у Вашынгтоне, якая працягвалася з 8 па 27 лютага 1861 г. і праводзілася па прапанове генеральнай асамблеі Вірджыніі. Пад старшынствам былога прэзідэнта Дж. Тайлера сабраліся прадстаўнікі 21 штата, усяго 132 чалавека. Склад дэлегацыі быў вельмі прадстаўнічы, аднак больш паловы ўдзельнікаў былі старэй за 50 год. Дж. Тайлер заклікаў устаць над партыйнымі разыходжаннямі і распрацаваць рэзалюцыю канферэнцыі, якая б аднавіла у краіне спакой і радасць. Аднак некаторыя палітыкі не бачылі у канферэнцыі сэнсу. Так, сенатар са штата Масачусэтс Ч. Самнер казаў, што хутка «нам прыйдзецца ўстаць перад тварам неабходнасці сілай прымушаць выконваць законы».

Канферэнцыя прапрацавала тры тыдні, пасля чаго 27 лютага прадставіла на разгляд Кангрэса 13-ю папраўку да Канстытуцыі, якая ўключыла большасць прапаноў Крытэндэна. Аднак Сенат адхіліў папраўку, а Палата прадстаўнікоў наогул яе не разглядзела.

Вышэй мы разгледзелі спробы мірнага вырашэння ўнутрапалітычнага крызісу ў ЗША, які паўстаў у краіне перад Грамадзянскай вайной. Былі прапанаваны канкрэтныя шляхі выйсця, аднак яны не далі плёну. На наш погляд, гэта атрымалася таму, што, па-першае, супярэчнасці паміж Поўднем і Поўначу дасягнулі свайго піку развіцця, а па-другое – сам сэцэсійны рух яшчэ хоць і зараджаўся на Поўдні, але меў ужо дастаткова моцы, каб супрацьстаяць такім спроба мірнага яго рэгулявання.

***Д. А. Касько***
*Науч. рук* ***Т. А. Шкрабова,***
*ст. преподаватель*

## ОСОБЕННОСТИ БЕЛОРУССКОГО ТРАДИЦИОННОГО ЖЕНСКОГО КОСТЮМА ЗАПАДНОГО И ВОСТОЧНОГО ПОЛЕСЬЯ

Традиционный народный костюм − один из главных элементов этнической культуры белорусов. Он ярко отражает характер народа, уровень его духовной и материальной жизни в разные исторические периоды.

Цель работы − характеристика особенностей белорусского традиционного женского костюма Западного и Восточного Полесья.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ